Ближе к концу свадьбы делят «каравай», первый кусок по местной традиции обязательно отдают молодым, чтобы съели вместе. Во время застолья молодые могут им кормить друг друга. Совместная еда и питьё также имеют древнее происхождение.

В завершении свадебной трапезы свекровь снимает с невесты фату и накидывает на голову платок, как знак её перехода в новое состояние.

Перед отъездом молодых в дом родителей жениха многие стали устраивать фейерверк – яркое и запоминающееся зрелище. Эмоциональный подъем в этот момент столь высок, что некоторые женщины плачут.

Затем под общее одобрение молодые собираются к отъезду. На первую брачную ночь их, как правило, сопровождают свидетели. Звучат шутки и всем понятные намеки.

На другой день чаще всего собирается только вся семья молодого и идёт к отцу с матерью молодой. Молодой муж должен поймать курицу, это значит, по мнению местных жителей, что он ловкий хозяин и хороший, «справный» муж. Также молодой приносит рыбу, которую накануне ловит сам или покупает в магазине, из нёе варят уху и угощаются. Аналогичные представления о взаимосвязи живой природы со способностью к деторождению широко известны у многих славянских народов [3, с.131].

Очевидно, что при вступленнии в брак современные жители Добруша, как и их предки, свято верят в необходимость совершения целого ряда обрядовых действий, которые способны непосредственнно оказывать влияние на совместную счастливую жизнь и семейное благополучие.

Круг этих ритуалов не ограничивается перечисленными выше. Тем не менее, приведенное описание дает также возможность вычленения как инвариантных, так и особенных черт свадебного обряда на территории Добруша и его окрестностей. Более того, выделенная нами сфера культурных представлений являет собой чрезвычайно удобный базовый объект в том числе и для реконструкции мифологической картины мира, характерной для изучаемой культуры.

Одновременно в области духовных ценностей свадебная обрядность таких малых городов, как Добруш, – необходимый и богатейший источник для описания и интерпретации других традиционных обрядов жизненного и календарного циклов, их структурно-функциональной системы.

ЛИТЕРАТУРА

1 Седакова, О.А. Поэтика обряда. Погребальная обрядность восточных и южных славян / О.А. Седакова. – М.: “Индрик”, 2004. – 320 с. (Традиционная духовная культура славян. Современные исследования.)

2 Толстые, Н.И. и С.М. О задачах этнолигвистического изучения Полесья / Н.И. и С .М. Толстые. // ПЭС. 1983. – С. 3 – 21.

3 Плотникова, А.А. Невеста и ребенок в свадебном обряде южных славян / А.А. Плотникова // Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры / Сост. Е.А. Белоусова; Отв. ред. С.Ю. Неклюдов. (Серия «Традиции – текст – фольклор). – М.: Российск. гос. гуманит. ун-т, 2001. – С. 130 – 150.

***У.П. Каваленка (Беларусь)***

## ПРАБЛЕМА ЗЯМЛІ І ВОЛІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.

Канец XIX стагоддзя стаў кульмінацыйным момантам грамадскага развіцця для народаў царскай Расіі (у тым ліку і для беларускага). Ідэі вызваленчых рухаў, рэгіянальнага, нацыянальнага адраджэння, культурныя і духоўныя пошукі былі закладзены значна раней дзейнасцю Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, А. Абуховіча, Ф. Тапчэўскага, М. Косіча, К. Каганца, Ядвігіна Ш. Яны ў вялікай ступені садзейнічалі актывізацыі сацыякультурнага руху на тэрыторыі заходняй часткі Расійскай імперыі. Натуральна, што гэтаму спрыялі лёсавызначальныя моманты ў гісторыі, эканоміцы, сацыяльным жыцці таго часу. Тая ж адмена прыгону, зараджэнне рэвалюцыйных ідэй пасля вайны з Напалеонам 1812

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

года, калі перадавая частка дваранства (беларуская шляхта) таго часу некалькі гадоў знаходзілася ў Заходняй Еўропе (Францыя, Германія). Там яны ўбачылі, што іх радзіма адстала ад развіцця цывілізацыі амаль на 100 гадоў, зразумелі, што па-ранейшаму жыць нельга, трэба нешта рабіць, каб не адстаць канчаткова. Стала магчымай спроба ваеннага перавароту на Сенацкай плошчы С.-Пецярбурга. Паўстанне не ўдалося па той простай прычыне, што ад яго кіраўнікоў не прагучала абяцанне зямлі і волі, сацыяльнага і нацыянальнага самавызначэння. Гэтага чакалі народы Усходняй Еўропы. Спатрэбіліся рэвалюцыі (1905, 1917), Першая сусветная вайна і ліквідацыя трох імперый (Германскай, Аўстра-Венгерскай, Расійскай).

Зерне, закладзенае французскай рэвалюцыяй, згаданыя вышэй падзеі не маглі не абудзіць у свядомасці перадавой часткі грамадства ідэі сацыяльнай роўнасці, пытанні зямлі і волі. Спроба завяваць гэта адбылася ў час шляхецка-сялянскага паўстання на тэрыторыі былога княства Літоўскага пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Натуральна, што вялікае значэнне мела дзейнасць прадстаўнікоў народнай інтэлігенцыі, якія, абапіраючыся на агульначалавечыя, гуманістычныя ідэалы, сталі выяўляць нацыянальна-самабытныя па змесце і форме ідэі і праблемы. Спачатку гэта была асветніцка-выдавецкая і грамадска-палітычная дзейнасць К. Каганца, Б. Эпімах-Шыпілы, братоў Івана і Антона Луцкевічаў, А. Уласава, Цёткі, Ядвігіна Ш., В. Ластоўскага і іншых. Актывізацыя прыпадае на пачатак XX стагоддзя. Штуршком стаў царскі маніфест “Аб свабодзе слова, сходаў, партый” ад 17 кастрычніка 1905 года. З’явіліся выдавецкія суполкі, пачалі выходзіць штотыднёвікі на беларускай мове (“Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша хата”, “Наша доля”, “Наша ніва”), газеты (“Гоман”, “Светач”, “Дзянніца”), часопісы (“Саха”, “Маладая Беларусь”, “Лучынка”), дзе актыўна друкаваліся Я. Купала, Я. Колас, В. Ластоўскі, С. Палуян, М. Багдановіч, З. Бядуля, А. Гарун, М. Гарэцкі, Я. Лёсік, Я. Журба і іншыя стваральнікі нацыянальна-культурнай, мастацка-эстэтычнай праграмы “нашаніўства”. Намеры былі рэвалюцыйнымі для свайго часу. Прама або ўскосна прапагандаваліся ідэі адраджэння нацыянальнай свядомасці, мовы, культуры, далучэння да еўрапейскіх здабыткаў, стварэння незалежнай дзяржавы, “вялікай” літаратуры.

Характэрная ў гэтых адносінах творчасць Я. Коласа, які ў традыцыях нашаніўскай эстэтыкі ў дарэвалюцыйны перыяд напісаў шэраг вершаў і празаічных твораў, у якіх праўдзіва малюе паднявольнае становішча беларускага селяніна, разважае над яго гаротным становішчам (“Песні жальбы”). Многія творы ўзніклі пад непасрэдным уздзеяннем грамадзянскай паэзіі А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Някрасава, А. Майкава (“Родныя вобразы”, “Наш родны край”, “Вёска”, “Многа слаўненькіх куточкаў”, “Не бядуй!”, “Мужык”, “Ворагам” і інш.).

Неўзабаве ўзніклі сатырычныя вершы, якія сведчылі аб эвалюцыі творчай канцэпцыі Я. Коласа ў напрамку да крытычнага рэалізма. Наследуючы лепшыя традыцыі нацыянальнай версіфікацыі, у творах “Асадзі назад!”, “Канстытуцыя”, “Вобразы самаўладдзя” і інш. аўтар прама або ўскосна негатыўна выказваецца аб існуючым дзяржаўным парадку. Лірычны герой яго паэзіі паступова прыходзіць да ўсведамлення сябе як асобы, чалавека, якому падуладны складаныя пачуцці і глыбокія думкі. Асабліва выразна гэта выяўляецца ў вершах аб роднай прыродзе (“Нёман”, “Усход сонца”, “Вясна”, “Адлёт жураўлёў”, “Зіма”, “Першы гром”, “Дуб”, “Чыгунка”, “Палескія вобразы”).

Аналагічныя праблемы вырашаюцца Я. Коласам і ў празаічных жанрах: апавяданнях (“Свабода”, “Думкі ў дарозе”, “Васіль Чурыла”, “Бунт”, “Нёманаў дар”, “Малады дубок”), літаратурных казках (“Дудар”, “У балоце”, “Жывая вада”, “Адзінокае дрэва”, “Зло – не заўсёды зло”, “Хмарка”, “Камень”, “Супраць вады”, “Стары лес”, “Чортаў камень”, “Даль” і інш.).

Асабліва паказальныя ў гэтым сэнсе паэмы “Новая зямля” (1911 – 1923), “Сымон-Музыка” (1911 – 1925). Часткі, напісаныя Я. Коласам у дарэвалюцыйны час, выяўляюць працалюбівы характар беларускага народа, яго знітаванасць з навакольным светам, унутранае багацце, уменне цаніць прыгожае. Выказваецца думка аб далучанасці простага чалавека “ад зямлі” да дасягненняў цывілізацыі, еўрапейскай культуры. Беларусу не чужыя думкі, выказаныя ў Бібліі, “Працах і днях” Гесіёда, “Песні пра зубра” М. Гусоўскага, “Яўгеніі Анегіне” А. Пушкіна, “Пане Тадэвушы” А. Міцкевіча, вуснапаэтычнай народнай творчасці.

Выключна рэалістычны характар паэмы “Новая зямля”, разнастайнасць і дасканаласць вобразна-выяўленчых сродкаў, арганічная сувязь з народнымі традыцыямі, фальклорам,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

добрае веданне аб’екта адлюстравання, багацце і хараство беларускай мовы, пейзажныя малюнкі не засланяюць галоўнай думкі аўтара твора, які разам са сваімі героямі думае аб волі. Надзейным сродкам яе набыцця Я. Колас лічыць валоданне зямлёй-карміцелькай на правах прыватнай уласнасці. Міхал, Антось, Ганна, дзеці стараюцца з усіх сіл, каб яе набыць. Дзе б яны не жылі, дбаюць аб ёй. Але была яна чужая, бо належыла іншым гаспадарам. Паездка дзядзькі Антося ў Вільню, наведванне банка, пазыка, якую ён атрымаў, здавалася б, вырашала шматвекавыя праблемы селяніна. Але, калі ўсё, здавалася б, было зроблена, галоўны герой паэмы раптам паміраe. І гэта не выпадкова. Бо праблема зямлі і волі была вырашана толькі ў выніку бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 года.

Адзін з першых дэкрэтаў новай улады надзяляў падушна кожнага селяніна зямлёй. А праз яе – воляй. Можна зрабіць вывад аб тым, што пасля рэвалюцыі адкрыўся новы шлях у жыцці для мільёнаў сялян. І сапраўды, у 20-я гады ХХ стагоддзя стала свабадней дыхаць. Беларусы атрымалі (хаця і фармальна) дзяржаўнасць, адносную самастойнасць у вырашэнні нацыянальных праблем. Пачала аднаўляцца культура, асвета, народная адукацыя. Спраўдзіліся мары аб свабодным жыцці. Зямлю падзялілі, народ быў абвешчаны вольным. Канцэптуальна Я. Колас быў на баку народа. Нагадаем, што за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе (1906) і рэвалюцыйныя ідэі ён быў пакараны царскімі ўладамі на турэмнае зняволенне (1908 – 1911).

Адначасова з паэмай “Новая зямля” Я. Колас пісаў вершы, у якіх выяўляецца глыбокі роздум над лёсам Радзімы (зб. “Водгулле” – “Да працы”, “На чужыне”, “Покліч”, “Беларускаму люду”, “Крыж”, “Звон шыбаў”, “Цені-страхі” і інш.), пратэст супраць шавінізму і нацыянальнага нігілізму (“Свіная філасофія”, “Свінні пад дубамі”), разгубленасць і адначасова заклікі да абуджэння роднага краю. Ліберал і дэмакрат Я. Колас убачыў, што ў выніку вялікай вайны, рэвалюцыі, іншаземнай акупацыі, устанаўлення новых парадкаў яго народ наўрад ці будзе вольным канчаткова.

Не выпадкова, што з пачаткам 20-х гадоў пісьменнік пасля не вельмі ўдалых эксперыментаў у паказе рэвалюцыі, падзей грамадзянскай вайны, рэалій савецкага жыцця (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “Адукацыя”, “У двары пана Тарбецкага”, “Хатка над балотам”) пачынае пісаць трылогію “На ростанях” (1921 – 1954). Аўтар паказвае жыццёвую эвалюцыю Андрэя Лабановіча, шлях героя ад асветніцкіх і ліберальных уяўленняў да рэвалюцыйнай дзейнасці. Твор Я. Коласа не проста аўтабіяграфічны. Ён звернуты да падзей дарэвалюцыйнага жыцця, якое пісьменнік добра ведаў.

Канцэптуальна і тыпалагічна блізкі да Я. Коласа і Я. Купала, які таксама прыйшоў у нацыянальную літаратуру перад 1917 годам (зб. “Жалейка”, 1908; “Гусляр”, 1910; “Шляхам жыцця”, 1913). У гэты ж час былі напісаны яго лепшыя паэмы (“Курган”, 1910; “Бандароўна”, 1913) і п’есы, больш раннія паэмы (“Зімою”, “Нікому”, “Калека”, “Адплата кахання”, “У Піліпаўку”, “За што?” – 1906 – 1908), перадваенныя ліра-эпічныя творы (“Магіла льва”, “Яна і Я” – 1913), драматычныя паэмы “Адвечная песня”, “Сон на кургане”, драматычны абразок “На папасе” – 1908 – 1913 і інш. П’есы “Паўлінка”, “Прымакі”, “Раскіданае гняздо” сведчаць, што класік нацыянальнай літаратуры разам са сваімі героямі пакутліва разважае над спрадвечнымі пытаннямі быцця, лёсам чалавека працы, шукае шляхоў да шчасця і волі.

Вобраз “раскіданай Беларусі” (М. Гарэцкі), спрадвечная сувязь з зямлёю і Бацькаўшчынай робяць яго твор тыпалагічна блізкім да праблематыкі “Новай зямлі” Я.Коласа, эпічных твораў “Зямля”, “Лявон Бушмар”, “Бацькаўшчына”, “Трэцяе пакаленне” К.Чорнага, раманаў “Язэп Крушынскі” Зм. Бядулі, “Сцежкі-дарожкі”, “Вязьмо” М. Зарэцкага, “Спалох на загонах” і “Праз гады” П.Галавача, “Мядзведзічы” К. Крапівы.

Асабліва абвастраецца роздум Я. Купалы над гістарычным лёсам Беларусі, простых людзей на фоне рэвалюцыі і падзей грамадзянскай вайны ў трагікамедыі “Тутэйшыя” (1922), перакладах “Слова аб палку Ігаравым”, публіцыстычных артыкулах (“Незалежнасць”, “Незалежная дзяржава і яе народы”, “Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год”, “Беларускае войска”, “Справа беларускага нацыянальнага гімна”) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тое, што адбывалася ў краіне сацыялізму, не задавальняла Я. Купалу. Пра гэта сведчыць яго творчасць 20-х гадоў ХХ стагоддзя. Напісанае ім у 30-я гг. можна лічыць часовым кампрамісам з уладамі. У большасці выпадкаў гэта творы рытарычныя і ілюстрацыйныя (паэмы "Безназоўнае", "Над ракой Арэсай", "З угодкавых настрояў", вершы "Дыктатура працы", "Сыходзіш, вёска, з яснай явы", "Госці", "Вечарынка", "Лён", "Табе, правадыр…", "Аб Сталіне-сейбіту" і г.д.).

Цяжка перааценіць значэнне творчасці М. Багдановіча, які далучаў беларускую літаратуру, яе эстэтыку да агульначалавечых ідэалаў, выкарыстоўваючы лепшыя нацыянальныя традыцыі, міфапаэтычную творчасць народа (нізкі вершаў "Старая Беларусь", "Старая спадчына", вершы "Прыйдзе вясна", "Дзед", "Народ, беларускі народ!", "Зорка Венера ўзышла над зямлёю…", "Не кувай ты, шэрая зязюля…", "Слуцкія ткачыхі", "Краю мой родны! Як выкляты богам…", "Жывеш не вечна, чалавек…" і інш.).

Прадаўжальнікам эстэтыкі "нашаніўства", нацыянальнага Адраджэння з'яўляецца М. Гарэцкі з яго інтэлектуальна-філасофскай, псіхалагічнай прозай, настойлівымі спробамі зразумець душу свайго народа, незразумелае і патаемнае ("Роднае карэнне", "У чым яго крыўда", "Страхаццё", "У панскім лесе", "Што яно?"). Як ніхто з яго сучаснікаў, М. Гарэцкі паспрабаваў шырока і глыбока паказаць чалавечую сутнасць на вайне (дакументальна-мастацкія запіскі "На імперыялістычнай вайне", апавяданні "Літоўскі хутарок", "Рускі", "Генерал", "На этапе" і інш.). Непасрэдны ўдзельнік Першай сусветнай вайны, ён не толькі рэалістычна і глыбока гуманістычна раскрыў трагедыю канфліктуючых бакоў, але і залажыў трывалыя традыцыі новага для нацыянальнай літаратуры жанру, узняў беларускую літаратуру да вышынь сусветнай, узроўню твораў Л. Талстога, А. Барбюса, Э.-М. Рэмарка, Э.Хемінгуэя.

Характэрныя грані нацыянальнага характару, беларускага жыцця раскрыты ў аповесцях М. Гарэцкага "Дзве душы" (1919), "Меланхолія" (1916 – 1921, 1928), "Люстрадзён" (1926 – 1930), драме "Антон" (1914), драматычным абразку "Жартаўлівы Пісарэвіч" (1922), іншых творах.

Імкненне стварыць эпапею народнага жыцця прыводзіць М. Гарэцкага да задумы напісання раманаў "Віленскія камунары" (1917 – 1930), "Камароўская хроніка" (1930 – 1932, 1937), якія разам з іншымі творамі ("Дзве душы, "Меланхолія", "Ціхая плынь", "На імперыялістычнай вайне") павінны былі скласці галоўную кнігу ягонага жыцця, стаўшы дасягненнем нацыянальнай прозы пачатку і першай трэці ХХ стагоддзя. Да гэтага часу ніхто з беларускіх празаікаў не ажыццявіў падобнай задумы (нават той жа І. Мележ).

Такім чынам, праблемы зямлі і волі і ў ХХІ стагоддзі будуць хваляваць розум нашых сучаснікаў. Яшчэ некалькі стагоддзяў назад Гегель выказаў вельмі слушную думку аб тым, што прыватная ўласнасць з'яўляецца асновай свабоды, дэмакратыі.

***Дз. Л. Мамачкін (Беларусь)***

## HOMO HOMINI LUPUS EST?
## (Беларуская драматургія ХХ ст. у пошуках адказаў на "праклятыя" пытанні)

Пачатак ХХ ст. для Расійскай імперыі стаў часам згасання і закату былой магутнасці. У сферы культуры ўвогуле і літаратуры ў прыватнасці гэта выявілася ў крызісе традыцыйных духоўных каштоўнасцей, хрысціянскі гуманізм як светапоглядная аснова грамадскай свядомасці быў пастаўлены пад пытанне. Спачатку грамадска-палітычнымі сіламі крайне левага кірунку, а пасля і ў літаратуры.

На ўскраінах метраполіі сітуацыя "смутнага часу" актывізавала нацыянальна-вызваленчы рух. Мясцовыя эліты дабіваліся пераразмеркавання ўладных паўнамоцтваў на сваю карысць. Вядома, літаратура як адна з форма грамадскай свядомасці прымала ў гэтых працэсах самы актыўны ўдзел.

У літаратуры "Паўночна-Заходняга края" працягваў сваё развіццё "народніцкі праект", пафасам якога была дэкларацыя права беларускага народа "людзьмі звацца".



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ